**19.** Помнік, пастаўлены ў Полацку, праславіў літару, якая стала сімвалам самабытнасці беларускай мовы. Пра якую літару ідзе размова?

**А)** ё. **Б)** я. **В)** ў. **Г)** і. **Д)** й.

---

**20.** У Старажытнай Грэцыі ўсе вершы чыталі пад акампанемент ліры, значыць, пад музыку. Адсюль, дарэчы, і ўзнікла паняцце … .



**А)** лірыкі. **Б)** прозы. **В)** драмы.
**Г)** камедыі. **Д)** рыфмы.

---

**21.** Аленка атрымала заданне выбраць з дадзеных прыкладаў устойлівае спалучэнне. Дапамажыце дзяўчынцы.

**А)** прасяная каша. **Б)** аўсяная каша. **В)** грэчневая каша.
**Г)** бярозавая каша. **Д)** манная каша.

---

**22.** Вясной на лугах, узлесках, у садах, па берагах рэк і азёр нібы нейкі чараўнік раскідвае залацістыя дываны. Гэта цвіце казялец едкі, або як яшчэ называюць гэту кветку, … .

**А)** дзядоўнік. **Б)** трыпутнік. **В)** вяснянка.
**Г)** курыная слепата. **Д)** неперстаўка.



---

**23.** У народных казках і паданнях часта сустракаюцца гісторыі пра арла. Выберыце з прапанаваных міфалагічныя назвы гэтай птушкі.

*1) гамаюн; 2) фенікс; 3) сірын.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**24.** Нашы бабулі, прабабулі з дапамогай іголкі з ніткай вышывалі на абрусах, сукенках, рубашках, ручніках маляўнічыя ўзоры, утвораныя рытмічным паўтарэннем аднаго ці папераменна некалькіх элементаў (фігур) – квадратаў, ромбаў, зорак і інш. Як называліся гэтыя ўзоры?



**А)** аранжыроўка. **Б)** арнамент.
**В)** шыфр. **Г)** шво. **Д)** малюнак.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 11. Тыраж 31800 экз. г. Мінск. 2019 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2019»

*Чацвер, 21 лютага 2019 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі слоў у прыказцы?

*Безсахіібаранысамцархлебанеесць.*

**А)** 6. **Б)** 7. **В)** 8. **Г)** 9. **Д)** 10.

---

**2.** Пра які месяц у народзе гавораць, што *“гэта пара́ замыкае лета”*?

**А)** пра чэрвень. **Б)** пра ліпень. **В)** пра жнівень.
**Г)** пра верасень. **Д)** пра кастрычнік.

---



**3.** Па народных павер'ях, русалкі найбольш любяць гушкацца на вецці … .

Выберыце патрэбныя варыянты:

*1) вярбы; 2) бярозы; 3) клёна;*
*4) таполі; 5) асіны; 6) ліпы.*

**А)** 1, 2. **Б)** 2, 3. **В)** 3, 4. **Г)** 4, 5. **Д)** 5, 6.

**4.** Дапоўніце народнае выказванне:

*Сонца нізка – ... блізка.*

**А)** суседка. **Б)** маланка. **В)** вечар.
**Г)** радасць. **Д)** сябры.



**5.** Колькі дзеясловаў ужыта ў сказе?

*Цікаўная вавёрка не пабаялася аднак грыбнікоў і смела спусцілася на зямлю, уважліва паглядзела вакол і шуганула рыжай маланкай між зялёнай навісі елак.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**6.** Дадзены радкі з верша Г. Бураўкіна “Рэкі Беларусі”.




*О, рэкі, рэкі Беларусі!*
*Сярод лугоў, сярод лясоў!*
*Калі я гімн саткаць збяруся*
*З блакітных вашых паясоў?*

Колькі ўсяго назоўнікаў у форме адзіночнага ліку вінавальнага склону ўжыта?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**7.** Выберыце з дадзеных назоўнікі, якія маюць два склады.

*1) Слуцк; 2) Орша; 3) Слонім; 4) Паставы.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**8.** Які лічэбнік прапушчаны ва ўстойлівым спалучэнні *на ... небе*?

**А)** пятым. **Б)** шостым. **В)** сёмым.
**Г)** восьмым. **Д)** дзявятым.

**9.** Колькі слоў з **[б]** ужыта ў вершаваных радках А. Дзеружынскага?

*Буська,*
*Бацянок,*
*Белы-белы*
*Кафтанок.*
*Басаногі ён,*
*Без ботаў,*
*Ходзіць,*
*Бродзіць*
*Па балотах.*

**А)** 0. **Б)** 4. **В)** 6. **Г)** 8. **Д)** 9.

**10.** Дапоўніце народнае выслоўе:

*Ваду ў ступе таўчы – ... .*

**А)** масла будзе. **Б)** вады не замуціць. **В)** вадой не разальеш.
**Г)** вада і будзе. **Д)** каша будзе.

**11.** Пра снег, што падае, у народзе гавораць, што гэта … .



**А)** белыя мухі лётаюць.
**Б)** белыя плямы лётаюць. **В)** камары лётаюць.
**Г)** белыя вароны лётаюць. **Д)** белыя мошкі лётаюць.

**12.** Колькі **[у]** у словах калыханкі?

*Люлі-люлі-люленькі,*
*Прыляцелі гуленькі,*
*Селі яны ў люленькі…*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**13.** У народзе існуе прыкмета:

*Сухі і цёплы верасень – ... .*

**А)** ранняя зіма. **Б)** позняя зіма. **В)** ранняя вясна.
**Г)** позняя вясна. **Д)** дажджлівая восень.

**14.** Вучням патрэбна знайсці адгадку народнай загадкі ў пераблытаных літарах. Дапамажыце ім.

*У залаты клубочак схаваўся дубочак.*

**А)** д, ж, у, о, л. **Б)** б, р, ы, г. **В)** н, с, о, п.
**Г)** э, а, х, р. **Д)** а, т, к, а, н, ш.

**15.** *Вялікі прамежак часу, які выдзяляецца па якіх-небудзь характэрных падзеях, з’явах,* называецца … .

**А)** эра. **Б)** год. **В)** эпоха. **Г)** тыдзень. **Д)** месяц.

**16.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя словы.

*1) группа; 2) массаж; 3) бассейн; 4) класс.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Якога слова не хапае ў афарызме?

*У студню вады не льюць, ... дроў не возяць.*

**А)** у лес. **Б)** у поле. **В)** у сад. **Г)** у парк. **Д)** у сквер.

**18.** Ёсць дзіўныя жывёлы: вушы ў іх малыя, пярэднія канечнасці зменены ў крылы, лётаюць звычайна вечарам і ноччу. Называюцца яны … .



**А)** цацэрукі. **Б)** курапаткі. **В)** стрыжы.
**Г)** совы. **Д)** кажаны.